## Сказы з аднароднымі членамі (без злучнікаў і са злучнікамі), знакі прыпынку

**Мэты:** сфарміраваць у вучняў уяўленне пра будову сказаў з аднароднымі членамі і іх ролю ў тэкстах, пазнаёміць з прыметамі аднародных членаў, спосабамі іх выражэння; удасканальваць уменне выяўляць у сказах аднародныя члены, вызначаць іх сінтаксічную і сэнсава-граматычную ролю ў тэксце, вымаўляць у маўленчай плыні з інтанацыяй пералічэння; раздзяляць коскай, карыстацца сказамі з аднароднымі членамі ў вусным і пісьмовым маўленні; выхоўваць цікавасць і павагу да роднага слова.

**Тып урока:** засваенне новых ведаў.

### Ход урока

***Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа***
***і ўмець дасканала валодаць ёю.***
Я.Колас

### I. Матывацыйна-арганізацыйны этап.

Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой на працу

*Весела гучыць званок,*
*Яго голас нам знаёмы,*
*Запрашаем на ўрок*
*Беларускай мовы!*

Добры дзень дзеці, рада вас бачыць, сядайце. Няхай сённяшні дзень для вас будзе спрыяльным, а ўрок будзе для вас удалым і плённым.

Аднойчы вучні звярнуліся да свайго настаўніка з пытаннем, які дзень тыдня самы спрыяльны, каб пачаць новае жыццё, каб стаць паспяховым, удалым, шчаслівым. Можа, гэта аўторак?

Настаўнік падумаў і адказаў вучням… Як вы думаеце, які дзень тыдня назваў настаўнік?

Настаўнік падумаў і сказаў: “Гэты дзень тыдня называецца *сёння”*.

Вы згодны з мудрым настаўнікам?

*Не адкладвай на заўтра тое, што можна зрабіць сёння.*

### II. Пазнавальна-аперацыйны этап

***Паведамленне тэмы, пастаноўка мэт і задач урока***

Вось і мы з вамі сёння паспрбуем выканаць усё тое, што запланавалі.

Паглядзіце на экран і скажыце, ці ёсць у гэтым сказе словы, якія адказваюць на адно і тое пытанне і адносяцца да аднаго і таго слова?

***Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа***
***і ўмець дасканала валодаць ёю.***
Я.Колас

- Вызначце, якім членам сказа яны з’яўляюцца.
- З якой інтанацыяй вымаўляюцца гэтыя словы?
- Як гэтыя словы называюцца?

Тэма нашага ўрока – “Сказы з аднароднымі членамі ( без злучнікаў і са злучнікамі), знакі прыпынку”.

- Што вам вядома пра аднародныя члены сказа яшчэ з малодшых класаў?

Што нам сёння неабходна зрабіць на ўроку*?(Паглыбіць веды пра аднародныя члены сказа. Навучыцца знаходзіць іх у сказах. Ставіць да іх пытанні, вызначаць сінтаксічную ролю, расстаўляць знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі і складаць схемы такіх сказаў).*

А зараз давайце параўнаем вашыя адказы з запісам на экране.




На экране запісаны сказы. Дзеці павінны знайсці аднародныя члены сказа, расставіць у сказе знакі прыпынку і зрабіць вывад, пры якіх умовах аднародныя члены сказа адасабляюцца на пісьме.

1. Лёгка, хораша, звонка спяваў гарманіст.
2. Навучыўся я матчынай мове і задуманым песням яе.
3. І хлеб, і песня, і шчасце прыходзяць да чалавека пасля шчырай працы.
4. Хлопчык пачаў даставаць з кошыка кветкі, і грыбы, і ягады.
5. Алесь узяў з сабою кнігу і сшытак, аловак і ручку.
6. Смех і дзіцячыя галасы даносіліся цяпер не з рэчкі, а з бульбянога поля.
7. Песня гучала ціха, але выразна.
8. Прачытаў хутка ды не вельмі ўважліва.

**III. Дыягнастычна-карэкцыйны этап**

**Заданне 1.**

На сталах у свучняў ляжыць папера са сказамі. Вучні знаходзяць сказы, у якіх ёсць аднародныя члены сказа, вызначаюць іх сінтаксічную функцыю, расстаўляюць у сказах знакі прыпынку і складаюць схемы (правяраюць па слайду).

1. За крайняй хатай вёсачкі далёка распасціраліся жоўтае поле.

2. *Прыдарожная канава зарасла травой з жоўтымі і белымі кветкамі.*

3. На прасторнай раўніне каля дарогі стаяла белая бяроза.

4. Восень прыбрала дрэвы ў залаты ўбор, і бяроза была шчаслівая.

5. Наступіла зіма.

6. *Шапаціць мне штосьці жыта, але слоў не гаворыць.*

7. *Снег засыпаў поле, лес, жыллё, людзей.*

8. *Мой край ясназоры, прайшоў ты нямала шырокіх і вузкіх дарог.*

9. Снежнае поле заблісчэла на вясновым сонцы.

10. *Пацяклі, загаварылі першыя ручаіны.*

11. *Чалавек павінен падарожнічаць і ведаць тую зямлю, на якой нарадзіўся.*

*12.Спакойнае і ціхае возера зачаравала падарожнікаў.*

**Заданне 2.**
Запісаць тэкст. Уставіць прапушчаныя літары, раскрыць дужкі, расставіць знакі прыпынку. Падкрэсліць аднародныя члены сказа. Скласці схемы сказаў.

Дарога

Др…жыць, млее (у,ў)далечыні лё(г,х)кая смуга. Яна вабі(т,ц)ь, (т,ц)ягне да сябе. Смуга ахінае далёкія вёскі, (у,ў)згоркі, палі. Хоч…цца хутч…й дайс(т,ц)і да іх, (у,ў)бачыць (у,ў)сё, як ёс(т,ц)ь.

**Заданне 3. Графічны дыктант.**
Настаўнік чытае сказы, а вучні складаюць іх схемы. Адзін вучань будуе схемы на дошцы.

1. І на вершалінах, і на прагалінах, і на ўзлессі ляжаў снег.
2. З нашай бульбы можна прыгатаваць дранікі, бабку, клёцкі.
3. Мелодыю чулі не адзінкі, а мільёны.
4. У ветраны дзень здаецца, што сонца толькі свеціць, але не грэе.

**Фізкультхвілінка**

Устаньце, беларусы, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца падцягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,

Вераценцам пакруціцеся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І на месца ціха сядзьце.

**IV. Заключны этап**

**1. Тэст**

**1.Аднароднымі з’яўляюцца тыя члены сказа, якія:**
1. адносяцца да аднаго і таго ж члена сказа і выконваюць адну і тую ж сінтаксічную функцыю;
2. звязаны паміж сабой падпарадкавальнай сувяззю;
3. адносяцца да аднаго і таго ж члена сказа, але выконваюць розныя сінтаксічныя функцыі.

**2. Аднароднымі членамі сказа могуць быць:**
1. толькі галоўныя члены сказа;
2. толькі даданыя члены сказа;
3. і галоўныя, і даданыя члены сказа.

3.**Аднародныя члены сказа злучаюцца:**
1. пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ;
2. пры дапамозе інтанацыі пералічэння;
3. пры дапамозе злучальных злучнікаў і інтанацыі пералічэння.

**4.Якую сінтаксічную ролю выконваюць у сказе выдзеленыя словы?** Люблю *бары, бярозкі і пушчы* яшчэ з ваеннай бежанскай пары.
1. Дапаўненне;
2. азначэнне;
3. дзейнік.

**5.Які са сказаў мае аднародныя члены?**
1. Ля Браслаўскіх азёр гусі-лебедзі мыліся.
2. Пячоркі і даліны купаюцца ў вясеннім сонцы.

**6. Вызначце сказ, у якім ёсць некалькі радоў аднародных членаў.**
1. Дзень спякотны і вясёлы з песняй жніўнаю прыйшоў;
2. Прабег па сэрцы і па кожнай жылцы пяшчотны, ласкавы вецярок.

**7. Адзначце сказ, у якім ёсць развітыя аднародныя члены.**
1. Туман то гусцеў, набываючы колер хмары, то радзеў, растаючы ў сонечным святле.
2. Люблю сівых дубоў калоны, і соснаў стромкія ствалы, і мёду поўныя калоды.

**8. Да якога сказа правільна пабудавана схема?**
1. На ўзвышшы стаяць у задуменным спакоі кучаравыя дубы-асілкі і моўчкі паглядаюць уніз на каляровую лугавіну [О і О].
2. Лес пры дарозе пухкае, трашчыць[О, О, О ].
3. Ад сонечных промняў ільдзінкі пераліваліся аранжавымі, чырвонымі, сінімі, блакітнымі іскрынкамі. [О, О, О].

**9. У якім сказе ёсць абагульняльнае слова?**

1. Змрочны гушчар пераходзіць непрыкметна ў зараснікі вольхі і лазы, у балоцістую нізіну.
2. У лесе выразна адрозніваюцца галасы берасцянак, лясных жаўрукоў, сініц, драздоў.
3. Тут аб'ядналіся разам усе выгоды: і лес, і луг, і шырокая рака, і зараснік.

**10.У якім сказе правільна расстаўлены знакі прыпынку?**

1. Поле злёгку хвалюецца і пераліваецца, то светла-зялёнымі, то цёмна-сінімі фарбамі.
2. У сонечным святле гарэлі сумным адвечным полымем і ліпы і бярозы каля хат і дрэвы ў недалёкім лесе.
3. Смуга ахінае далёкія вёскі і ўзгоркі, палі і пралескі.

**2. Падвядзенне вынікаў урока**

Пракаменціраваць усе адзнакі, даць парады тым, у каго не ўсё атрымалася.

**3.Рэфлексія**

- Што новага вы даведаліся на ўроку?
- Ці дасягнулі пастаўленых мэт?
- Над чым яшчэ трэба папрацаваць дома?

А цяпер дазвольце мне ахарактарызаваць вашу работу на сённяшнім уроку (складанне сінквейна):

Вучні

Актыўныя, разумныя.

Вызначалі, тлумачылі, даказвалі.

Выказваю ўдзячнасць за працу.

Малайцы!

**4.Дамашняе заданне**

п. 26, пр. 181